# Ушанаваны Агінскі

**СЛОНІМ. На новым будынку драматычнага тэатра ўсталявана мемарыяльная шыльда з выявай Міхала Казіміра Агінскага.**

Агінскі – Слонім – тэатр. Імя гетмана Вялікага княства Літоўскага – заснавальніка традыцый тэатральнага мастацтва, мецэната – непарыўна звязана са старажытным горадам над Шчарай. Менавіта ён рэканструяваў колішні палац выдатнага дзяржаўнага і грамадскага дзеяча ВКЛ Льва Сапегі, які 47 гадоў быў старастам слонімскім і пакінуў значны след на слонімскай зямлі.

Будаўніцтва і рэканструкцыя тэатра былі завершаны ў 1777 годзе, і ён пачаў дзейнічаць. Для пастаноўкі спектакляў выкарыстоўваліся найлепшыя для таго часу тэхнічныя сродкі, якія дазвалялі лёгка мяняць дэкарацыі і нават "выводзіць" на сцэну сапраўдныя караблі. Пры тэатры дзейнічала балетная школа, балет якой канкурыраваў з каралеўскім тэатрам у Варшаве. Пры сваёй "сядзібе музаў" Агінскі стварыў вялікі ансамбль вакалістаў і інструменталістаў, які не саступаў самым лепшым музычным калектывам Заходняй Еўропы.

М.-К.Агінскі таксама быў выдатным выканаўцам на некалькіх музычных інструментах і…пісьменнікам, які выдаў некалькі кніг у сваёй слонімскай друкарні.

А цяпер, дзякуючы слонімскаму скульптару Леаніду Богдану і кіраўніку прыватнага прадпрыемства "Гранви" Уладзіміру Вількіцкаму, Агінскі назаўсёды "прапісаўся" у тэатры, адкрыццё якога ў новым будынку адбылося напрыканцы сакавіка.

Пасля ўрачыстага адкрыцця мемарыяльнай шыльды з удзелам старшыні райвыканкама Алега Таргонскага юныя сланімчане выканалі танец "Паланэз" пад музыку вядомага паланэза "Развітанне з Радзімай".

**Галіна РАМАНЧУК**

ГЛ 21.05.14 №57